*Энгельс Дарашэвіч*

# РЭВІТАЛІЗАЦЫЯ ФАЛЬКЛОРУ

**Існаванне фальклорных адзінак.** Архіп Перттунен – адзін з карэльскіх этнафораў, ад якіх у XIX стагоддзі былі запісаны руны эпасу «Калевала», распавядаў пра іх засваенне: «Калі мы з бацькам рыбачылі, звычайна адпачывалі на беразе возера ля вогнішча… У нас быў памочнікам мясцовы жыхар, таксама добры спявак, хоць і не роўня майму бацьку-нябожчыку. Цэлымі начамі яны пяялі ля вогнішча… і ніколі ў адну ноч не гучала двойчы адна руна. Я, хлопец, сядзеў і слухаў і вывучыў так свае лепшыя песні» [1, с.14].

Асноўная ўмова існавання фальклору – вітальнае (ад *лац.* vita – «жыццё») – *жывое бытаванне традыцыі*. Без самааднаўлення, перадачы «з голаса на голас», прамаўлення, візуалізацыі кожная фальклорная адзінка (казка, песня, легенда, абрад, гульня) ператвараецца ў мёртвы музейны артэфакт. Навукоўцы сёння ўсё большую ўвагу надаюць культурнай спадчыне, «літара» і «дух» якой перадаваліся вусным шляхам – т.зв. спадчыне вуснай традыцыі (oral heritage of humanity) ці, як часцей гавораць, нематэрыяльнай культурнай спадчыне (intangible heritage of humanity).

**Ахоўныя спісы фальклору.** Нематэрыяльная культурная спадчына (НКС) сёння бярэца пад ахову як міжнароднай супольнасцю, так і дзяржавай. У Беларусі праца па выяўленні і наданні статуса гісторыка-культурнай спадчыны элементам і з'явам фальклору набывае асаблівае значэнне ў святле далучэння нашай краінай (адной з першых) да Канвенцыі аб ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны UNESCO. Гэты міжнародны дакумент зацверджаны Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 29.12.2004 г. № 627. Канвенцыя UNESCO ахоўвае НКС, якая перадаецца ад пакалення да пакалення, пастаянна ажыццяўляецца супольнасцямі і групамі ў пэўным навакольным ландшафце (у іх узаемадзеянні з прыродай і іх гісторыяй) і фарміруе ў іх пачуццё самабытнасці і спадкаемнасці, спрыяючы тым самым павазе да культурнай разнастайнасці і творчасці чалавека (пункт 1 артыкула 1 Канвенцыі). Такім чынам, міжнароднай супольнасцю прызнаюцца ў якасці НКС толькі аўтэнтычныя праявы фальклору, бытуючыя ў рэальным часе і прасторы. Яны заносяцца ў Urgent Safeguarding List UNESCO і бяруцца пад ахову.

У 2009 годзе, упершыню, дзякуючы фальклярыстам і супрацоўнікам UNESCO (У.Шчасны, Т.Кухаронак, В.Калацэй, Р.Гамзовіч) адбылося ўключэнне абрада Цары ў Urgent Safeguarding List і Беларусь атрымала датацыю 120 000 $ на захаванне гэтай адзінкі НКС. Адпаведна закону Рэспублікі Беларусь «Об охране историко-культурного наследия Республики Беларусь» нематэрыяльныя гісторыка-культурныя каштоўнасці вызначаюцца як праявы творчасці чалавека, магчымае матэрыяльнае ўвасабленне якіх не аказвае ўздзеянны на іх існасць. У Дзяржаўным спісе гісторыка-культурных каштоўнасцей сёння 5000 аб'ектаў, якія знаходзяцца пад аховай дзяржавы. З іх каля 70 аб'ектаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны, сярод якіх: Тураўскі карагод вёскі Пагост Жыткавіцкага раёна; Ваджэнне і пахаванне стралы вёскі Казацкія Балсуны Веткаўскага раёна; Цары вёскі Семежава Капыльскага раёна; мясцовы песенны стыль выканання традыцыйных абрадавых і пазаабрадавых песень аўтэнтычнымі фальклорнымі гуртамі «Журавушка», «Глыбокія Крыніцы», «Паваляжі» вёсак Закальное, Обчын, Ямінск Любанскага раёна; мясцовы стыль песеннай, танцавальнай і народна-апавядальнай лакальнай традыцыі міжрэчча Сожа і Проні вёскі Галавенчыцы Чаускага раёна; творчасць Тарасюка М.В., якое ўвасоблена ў творах народнага дэкаратыўна-прыкладного мастацтва (інсітная драўляная скульптура).

На вышэйназваныя аб'екты распаўсюджваюцца патрабаванні Закона «Об охране историко-культурного наследия Республики Беларусь». Зыходзячы з артыкула 53 Закона, на «Тураўскі карагод» і «Ваджэнне і пахаванне стралы» мясцовымі ўладамі падпісаны ахоўныя абавязкі, якія зарэгістраваны ў Міністэрстве культуры. У вёсцы Пагост, адпаведна артыкулу 31 Закона, усталявана ахоўная дошка [2].

**Рэвіталізацыя фальклору як сацыяльны працэс.** Рэвіталізіраваны (вернуты да жыцця) могуць быць як латэнтна (схавана, не яўна выражана) існуючыя фальклорныя адзінкі, так і часова страчаныя. Пры намеры рэвіталізаваць фальклор неабходна праводзіць дзейнасць па трох накірунках: **ахоўную** (праца з носьбітамі нематэрыяльнай культурнай спадчыны ў мэтах іх падтрымкі і стымуляцыі працэсу перадачы нематэрыяльнай культурнай спадчыны паміж пакаленнямі); **этнакультурна-выхаваўчую** (праца з дзецьмі і моладдзю ў мэтах інтэгравання нематэрыяльнай культурнай спадчыны ў іх асяроддзе); **статыстычна-рэпрэзентатыўную** (маніторынг нематэрыяльнай культурнай спадчыны, інфармаванне пра яго вынікі дзяржаву і міжнародную супольнасць).

**Тэхналогія рэвіталізацыі фальклору.** Рэвіталізацыя – складаны працэс, але нам наканавана ёю займацца, паколькі вывучэнне фальклору без намаганняў яго захаваць не мае сэнсу. Для адчувальных вынікаў рэвіталізацыі ў агульнабеларускім маштабе патрэбны фінансавыя і сацыяльныя ўкладанні, у першую чаргу – актыўная пазіцыя дзяржавы. Вядома, што ў Ізраіле датацыі на падтрымку суполак, якія вядуць традыцыйны лад жыцця, выхоўваюць дзяцей у рэчышчы традыцыйнай культуры (дрэс-код, традыцыйныя святы, выкананне прадпісанняў Торы, традыцыйныя спевы) штогод дасягае трох з паловай мільярдаў $. Грошы вялікія, але іх выдзяляюць, бо ведаюць: не будзе традыцыйнай культуры – не будзе Ізраіля.

Спецыфіка эканомікі Усходней Еўропы (а часткова і свядомасць яе грамадстваў) пакуль не дазваляе падтрымліваць яе традыцыі ў такіх памерах. Ад фальклярыстаў зараз патрабуецца адпрацаваць мадэлі рэвіталізацыі, якія з цягам часу (пры спрыяльных акалічнасцях) могуць быць укаранены ў жыццё. Сёння наканавана займацца «першай прыступкай» на шляху да рэвіталізацыі – мастацкай рэканструкцыяй. З 2004 года у рамках навучальнага працэсу спецылізацыі «Этнафоназнаўства» даследчыца Таццяна Пладуновай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

распрацавана методыку мастацкага рэканструявання каляндарных абрадаў. На пачатку неабходна распрацаваць *абрадавую карту* свята. У яе аснове – класіфікацыя тэкстаў песень і методыка даследавання абрадаў даследчыкаў Мікіты і Святланы Талстых. Яны ўяўлялі абрадавую дзею перадусім як сукупнасць пэўных кодаў. Архітэктоніка іх выбудоўваецца так: тэмпаральны код – час правядзення абраду (свята); акцыянальны код – паслядоўнасць абрадавых дзей (рытуал); лакатыўны код – месца правядзення абраду; персанальны код – кола ўдзельнікаў, наяўнасць маскіраваных персанажаў; атрыбутыўны код – выкарыстанне абрадавых атрыбутаў, адзення; музычны код – тыпавыя напевы з адмысловымі этнафанічнымі прыкметамі і гукаідэал інструментльнай этнафоніі; вербальны – наяўнасць заклікаў, замоў, зычэнняў у абрадзе.

Распрацаваная абрадавая карта (мал. 3) можа быць рэкамендавана этнапедагогам, кіраўнікам фальклорных калектываў, рэжысёрам відовішчаў для сістэматызацыі абрадавых кампанентаў свят, як даследчы метад іх мастацкага рэканструявання і рэвіталізацыі .

Абрадавая карта свята______ у рэгіёне (вёсцы)____________

| Акцыя-нальны код | Тэмпа-ральны код | Лака-тыўны код | Перса-нальны код | Атрыбу-тыўны код | Музычна-вербальны код | Музычна-інструмен-тальны код | Пластыч-ны код |
|---|---|---|---|---|---|---|---|

*Малюнак 1* – Абрадавая карта свята паводле Т.Пладуновай (узор)

З улікам усяго вышэйадзначанага магчыма прадставіць наступную праграму мастацкай рэканструкцыі каляндарна-абрадавага свята на дакументальнай аснове, складзеную з чатырох этапаў. *Даследчы этап.* Аналіз абрадавай традыцыі і яе рэгіянальных адметнасцей. Збор і пашпартызацыя фальклорнага матэрыялу. Сістэматызацыя фальклорнага матэрыялу паводле прыведзенай вышэй абрадавай карты. Расшыфроўка, сітэматызацыя тыпавых напеваў і дапасаваных да іх песенных тэкстаў. *Арганізацыйна-метадычны этап.* Афармленне падабраных этнафанічных і танцавальна-гульнявых узораў у рабочы нотны зборнік альбо ў фанатэку (напрыклад, «Калядны спеўнік рэгіёну (вёскі)»; складанне сцэнара паводле акцыянальных кодаў абрадавага свята з больш дэталёвым пазначэннем ходу абрадавых падзей і асобных момантаў свята, часу і месца іх правядзення; кола ўдзельнікаў і завадатараў свята, абрадавых персанажаў, маскіравання і атрыбутыкі; зместу прымеркаванай да свята рэкрэацыйна-забаўляльнай часткі. Рэжысёрскае вырашэнне кожнага з эпізодаў свята. *Вучэбна-рэпетыцыйны этап.* Фарміраванне спеўных гуртоў – ілюстратараў этнафоніі абрадавага рэгіёна (фальклорныя калектывы ўстаноў культуры і адукацыі, мясцовыя жыхары вёскі, горада). Развучванне з імі песень, гульняў і танцаў з рабочага «Спеўніка». *Прэзентацыйна-творчы этап.* Адпраўленне свята ў натуральных умовах бытавання адпаведна традыцыйнай даце і ў час, належны кожнай падзеі, з уключэннем у святочную дзею ўсіх прысутных. *Аналітычны этап.* Аналіз зробленай працы, яе дакументаванне і архівацыя.

На аснове гэтай методыкі свята магчыма адаптаваць пад рэгіянальнае, ці агульнанацыянальнае – шляхам вылучэння асобных абрадавых этапаў і падбору да іх песень (адпаведна мэце правядзення свята).

Методыка мастацкага рэканструявання каляндарных абрадаў («першая прыступка» на шляху да рэвіталізацыі) прайшла паспяховую апрабацыю ў шэрагу дыпломных праектаў выпускнікоў спецыялізацыі «Этнафоназнаўства». Сёння актыўна абмяркоўваюцца і тэстуюцца іншыя мадэлі рэвіталізацыі, якія з цягам часу (пры спрыяльных акалічнасцях) могуць быць укаранены ў масавым парадку і паўплываць на механізмы пераемнасці ў традыцыйных асяродках. Асноўная надзея фальклярыстаў – распрацоўка і зацвярджэнне Міжгаліновай дзяржаўнай праграмы «Традыцыйная культура и моладзь Беларусі», якая, паводле рашэння Калегіі Міністэрства культуры (Пратакол Калегіі МК № 06 ад 27.06.2012, пункт 14), павінна быць скіравана на аднаўленне фальклору на вёсцы – ў асяродку яго натуральнага бытавання.

**Спіс літаратуры:**


1. Куусинен, Отто. Эпос «Калевала» и его творцы / Отто Куусинен // Калевала. Избранные руны карело-финского народного эпоса в композиции О.В.Куусинена. – Петрозаводск : Карелия, 1973. – С. VIII – XLIII.
2. Хвир, Н. Состояние и проблемы охраны нематериального культурного наследия Республики Беларусь / Н. Хвир // Аўтэнтычны фальклор: праблемы вывучэння, захавання, перайманння : зб. навук. прац удзел. III Міжнар. навук.-практ. канф. (Мінск, 29 – 30 красав. 2009 г.) / БДУКМ ; рэдкал.: Мажэйка М.А. (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БДУКМ, 2009. – С. 34 – 35.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ